МГПУ им. И.П.Шамякина

# ПРЫЁМЫ ФАРМІРАВАННЯ НАВЫКАЎ ПРАВАПІСУ Ў ЧАЦВЁРТАКЛАСНІКАЎ НА ЎРОКАХ РОДНАЙ МОВЫ

***Гарбачэўская В. А.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

На ўроках беларускай мовы малодшыя школьнікі паспяхова засвойваюць вучэбны матэрыял тады, калі праяўляюць пазнавальную самастойнасць, калі ўзровень іх самастойнай працы павышаецца, калі, на

думку Т. В. Напольнавай, выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як *пастаноўка праблемных задач і заданняў часткова-пошукавага характару* [1, с. 95].

Пры засваенні тэарэтычных ведаў і фарміраванні арфаграфічных навыкаў можна выкарыстоўваць праблемныя задачы, праверaныя намі ў час педагагічнай практыкі:

1) растлумачце выбар напісання выдзеленых літар: *в**я**сёлы – в**е**с**я**льчак, л**я**снік – л**е**снікоў, н**я**шчасце – н**е**шчаслівы*;

2) замяніце спалучэнні назоўніка з прыназоўнікам такім чынам, каб пры гэтым не змяніўся сэнс словазлучэнняў: *хлеб з пшаніцы – (пшанічны хлеб), пярсцёнак з золата – ... , дом з дрэва – ... , пячэнне з аўса – ...* ;

3) вызначыце час дзеясловаў: *пайшоў, ляцяць, прыедзе, гавораць, імчыцца;*

4) падбярыце да слоў аднакаранёвыя антонімы з прыстаўкамі *пера*-, *пры*-, *вы*-: *адвязаць, недаплаціць, ускочыць;*

5) абазначце ў словах корань: *насілкі, пераносіць, нёс, нясу, несці*;

6) вызначыце род назоўнікаў: *нов… раяль, дробн… соль, залат… медаль, моцн… боль, зл… сабака*;

7) замяніце дзеясловы так, каб яны набылі форму множнага ліку: *чытае – (чытаюць), піша – ... , працуе – ... , гаворыць – ... , сядзіць – ...* ;

8) падбярыце да назоўнікаў роднасныя дзеясловы ў неазначальнай форме: *ноч – (начаваць), плывец – ... , вячэра – ... , пераход – ... ;*

9) пастаўце прыметнікі ў патрэбным родзе: *(белы) воблака, (цёмны) хмара, (высокае) дрэва, (шырокі) акно, (прыгожы) дзяўчынка*.

У выніку рашэння такіх задач вучні, па-першае, вучацца лагічна разважаць; па-другое, знаходзяць выхад з нестандартных сітуацый; па-трэцяе, у іх фарміруюцца трывалыя навыкі правапісу.

**Літаратура**

1 Напольнова, Т. В. Активизация мыслительной деятельности учащихся на уроках русского языка / Т. В. Напольнова. – М.: Просвещение, 1983. – 145 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина